## СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ:

1. Кузнецова, В. В. Коммуникативно-речевая компетенция – основа профессиональной культуры учителя / В. В. Кузнецова // Человек и образование. – 2010. – № 2. – С. 71–73.
2. Кашлев, С. С. Интерактивные методы обучения : учебно-метод. пособие / С. С. Кашлев. – 2-е изд. – Минск : ТетраСистемс, 2013. – 224 с.
3. Русский язык: учеб. пособие для 3-го кл. учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения : в 2 ч. / М. Б. Антипова [и др.]. – Минск : Нац. ин-т образования, 2017. – Ч. 1. – 144 с. : ил.

**УДК 373.31**

# ІНТЭРАКТЫЎНЫ МЕТАД «КАЗАЧНАЯ МАЗАІКА» НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ Ў ІІ КЛАСЕ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ КАЗАК

**Шылава Алена Савельеўна,**
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі БДПУ імя М. Танка,
**Мурашка Наталля Уладзіміраўна**
Аспірант БДПУ імя М. Танка,
Навуковы кіраўнік – Турчанка Ірына Алексееўна
Мінск, Рэспубліка Беларусь

***Анатацыя:*** *праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў I–IV класаў на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі выклікае неабходнасць разумення яе сутнасці для пошуку і ўкаранення новых падыходаў, якія б спрыялі эфектыўнаму засваенню ведаў і забяспечвалі дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці.*

***Ключавыя словы:*** *маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя, інтэрактыўны метад «Казачная мазаіка».*

Праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі з'яўляецца актуальнай на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Для яе вырашэння мы прапануем актыўнае выкарыстанне інтэрактыўных метадаў на ўроках літаратурнага чытання, якія спрыяюць эфектыўнаму засваенню ведаў і забяспечваюць дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці.

Інтэрактыўны метад «Казачная мазаіка», які часцей ў літаратуры можна сустрэць пад назвай «Мазаіка», быў адаптаваны намі для прымянення з вучнямі пачатковых класаў на ўроках замацавання абагульнення і сістэматызацыі ведаў.

Мэты правядзення метаду:

- замацоўваць, абагульняць і сістэматызаваць веды, якія навучэнцы вывучалі па тэме, раздзеле, на працягу чвэрці, паўгоддзя ці навучальнага года;
- развіваць чытацкія ўменні, наладжваць сэнсавыя сувязі;
- развіваць уменні працаваць у камандзе.

Мазаіка – гэта забаўляльная гульня для дзяцей, якая мае на ўвазе стварэнне і фарміраванне выявы пры дапамозе падбору, кампаноўкі і фіксацыі на розных паверхнях каляровых элементаў. Разнавіднасццю мазаікі з’яўляюцца пазлы, збор якіх вельмі падабаецца дзецям малодшага школьнага ўзросту.

Збор пазлаў дазваляе пагружацца ў дзейнасць і канцэнтраваць на ёй увагу; развіваць уяўленне, лагічнае мысленне, цэласнасць успрымання, дробную маторыку, а таксама атрымліваць задавальненне ад праведзенай працы і радавацца атрыманаму выніку.

Адрозненне пазлаў ад разрэзаных карцінак ці мазаікі заключана ў тым, што яны маюць крывую лінію злучэння дэталяў. Збіраючы пазлы, неабходна супаставіць форму адной дэталі з формамі суседніх дэталяў. Пры гэтым неабходна ўлічваць, што на іх намалявана і ці атрымліваецца пры іх злучэнні суцэльная выява.

Але замест пазлаў на ўроках літаратурнага чытання пры вывучэнні беларускіх народных казак мы прапануем раздаваць не карцінкі, а вытрымкі ці разрыўныя часткі тэкста адной казкі, без яе назвы. Заданне заключаецца ў тым, каб, зачытаўшы ўсе пазлы, здагадацца і адказаць:

- як называецца казка?
- хто аўтар казкі?
- скласці пазлы: вытрымкі з тэксту ў паслядоўнасці падзей, якія адбываюцца, і зачытаць іх.

**Этапы рэалізацыі метаду «Казачная мазаіка».**

***Першы этап.*** Настаўнік размяркоўвае вучняў на чатыры групы пры дапамозе карткак рознага колеру: жоўтай, сіняй, чырвонай або зялёнай, якую яны бяруць са стала настаўніка. Вучні, якія абралі карткі аднаго колеру, трапляюць у адну каманду. У кожнай створанай групе навучэнцы выбіраюць капітана каманды.

***Другі этап.*** Капітаны каманд выходзяць да дошкі і са стала настаўніка бяруць адзін з пранумараваных канвертаў (№№ 1, 2, 3, 4), у якім знаходзяцца пазлы для каманды (вытрымкі з тэкстам па пэўнай казцы, без назвы): па адной разрыўнай часцы для кожнага ўдзельніка групы, а таксама заданні для групы:

- зачытаць пазлы;
- вызначыць назву казкі;
- назваць аўтара казкі;
- скласці пазлы ў паслядоўнасці падзей, якія адбываюцца ў казцы;
- падрыхтаваць кароткі пераказ казкі.

Настаўнік загадзя рыхтуе пазлы для ўдзельнікаў кожнай групы і раскладвае іх у канверты.

Падрыхтаваныя настаўнікам пазлы могуць быць простымі і складанымі. Праводзячы гэты метад на ўроку ўпершыню настаўніку для стварэння сітуацыі поспеху для кожнага вучня з розным узроўнем матывацыі, неабходна гэта ўлічваць.

Простыя пазлы могуць змяшчаць вытрымкі з тэксту, якія будуць адразу падказваць вучням з якой яны казкі, а складаныя могуць быць складзены так, што вучням па вытрымках з тэксту будзе вельмі цяжка здагадацца і вызначыць, з якой яны казкі.

Пакажам розныя варыянты стварэння пазлаў па адных і тых жа казках ад прасцейшага і лёгкага да больш складанага і цяжкага варыянту.

Колькасць пазлаў у кожным канверце павінна адпавядаць колькасці вучняў у кожнай камандзе. Калі ў класе 32 вучні, то ў кожным канверце будзе па 8 пазлаў. Калі колькасць вучняў у класе меншая, то і пазлаў можа быць меншай або некаторым вучням прапанаваць ні адзін, а па два пазлы. Настаўнік сам прымае рашэнне, якое яму больш спадабаецца, сам

вызначае якую колькасць пазлаў трэба для кожнай групы. Акрамя таго, трэба ўлічваць магчымасці ўдзельнікаў кожнай групы. Калі ў групе аказалася больш вучняў з нізкім узроўнем матывацыі, то настаўнік можа ім сам прапанаваць канверт з пазламі з казкі, змест якой меншы па аб'ёме, напрыклад: «Лісіца і гусак» – беларуская народная казка [1, с. 115].

**Першы варыянт пазлаў**

**Пазлы для ўдзельнікаў групы № 1** («Хітры вол» – беларуская народная казка [1, с. 116–118]).

- ✓ «Косіць, завіхаецца, на неба паглядае: ці не відаць адкуль хмары?»
- ✓ «Паверыў Воўк і пайшоў шукаць сабе падмогі.»
- ✓ «Што Валу рабіць? Давай ён далей хітрыць.»
- ✓ «Ідзе Воўк. Заглядзеўся на Вала.»
- ✓ «Нарэшце прыходзяць на балота цэлаю чарадою.»
- ✓ «Двор Вала высокім частаколам абгароджаны.»
- ✓ «Ды і шкура ад вашых воўчых зубоў цэлая засталася.»
- ✓ «– Я не толькі цябе, а і двух такіх не баюся!»

**Пазлы для ўдзельнікаў групы № 2** («Лісіца і Гусак» – беларуская народная казка [1, с. 115]).

- ✓ «Гусак, Гусак, я цябе з'ем!»
- ✓ «Толькі дазволь мне перад смерцю патанцаваць.»
- ✓ «Засмуціўся Гусак, а рабіць няма чаго.»
- ✓ «Гусак пачаў махаць крыламі ды з нагі на нагу пераступаць.»
- ✓ «Танцуй сабе, а з'есці я цябе яшчэ паспею.»
- ✓ «Вось дык Гусак! Вось дык танцор!»
- ✓ «Хай будзе так, Лісачка.»
- ✓ «Так і засталася Лісіца з разяўленым ротам.»

**Пазлы для ўдзельнікаў групы № 3** («Муха-пяюха» – беларуская народная казка [1, с. 127–129]).

- ✓ «Мела яна каляску і шэсць камароў.»
- ✓ «Едзе яна дарогаю, едзе шырокаю – бяжыць мышка ... »
- ✓ «А я Па сажалках Рагатуха.»
- ✓ «Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю – сядзіць на галінцы Вавёрка.»
- ✓ «Па Елках Скакуха. А ты хто?»
- ✓ «А я Праз дарогу Скок.»
- ✓ «А я Галодны Воўк. Усіх вас паем!»
- ✓ «Пачулі гэта камары, падняліся ўгору і паляцелі разам з каляскай.»

**Пазлы для ўдзельнікаў групы № 4** («Каза-манюка» – беларуская народная казка [1, с. 120–125]).

- ✓ «Пагнала дачка пасвіць казу.»
- ✓ «Дзед на бабу насварыўся, што дрэнна Казу пасвіла.»
- ✓ «Увечары вярнуўся дахаты, пераапрануўся, сеў на прызбе і чакае Казу з пашы.»
- ✓ «Сеў зайчык пад ёлачкай і плача.»
- ✓ «І расказаў Мядзведзю пра сваю бяду.»
- ✓ «Я таго звера ведаю – гэта дзедава Каза-манюка ... »
- ✓ «Падышоў Воўк да зайчыкавай хаткі, пастукаў хвастом у дзверы і кажа …»
- ✓ «Як пачула Каза пра дзеда з касою, напужалася і кулем выскачыла з хаткі.»

**Другі варыянт пазлаў**

**Пазлы для ўдзельнікаў групы № 1** («Хітры вол» – беларуская народная казка [1, с. 116–118]).

- ✓ «… на неба паглядае: ці не відаць …»
- ✓ «… і пайшоў шукаць сабе падмогі.»
- ✓ «Давай ён далей хітрыць.»
- ✓ «Ідзе Воўк.»
- ✓ «… прыходзяць на балота ...»
- ✓ «… высокім частаколам абгароджаны.»
- ✓ «… ад вашых воўчых зубоў цэлая ...»
- ✓ «… не толькі цябе, а і двух такіх …»

**Пазлы для ўдзельнікаў групы № 2** («Ліціца і Гусак» – беларуская народная казка [1, с. 115]).

- ✓ «… я цябе з'ем!»
- ✓ «… дазволь мне перад смерцю ...»
- ✓ «… а рабіць няма чаго …»
- ✓ «… махаць крыламі ды з нагі на нагу …»
- ✓ «… з'есці я цябе яшчэ ...»
- ✓ «Вось дык танцор!»
- ✓ «Хай будзе так …»
- ✓ «… з разяўленым ротам.»

**Пазлы для ўдзельнікаў групы № 3** («Муха-пяюха» – беларуская народная казка [1, с. 127–129]).

- ✓ «Мела яна каляску…»
- ✓ «… бяжыць мышка ... »
- ✓ «… Па сажалках ...»
- ✓ «… сядзіць на галінцы ...»
- ✓ «Па Елках ...»
- ✓ «… дарогу Скок.»
- ✓ «… Усіх вас паем!»
- ✓ «… падняліся ўгору і паляцелі ...»

**Пазлы для ўдзельнікаў групы № 4** («Каза-манюка» – беларуская народная казка [1, с. 120–125]).

- ✓ «Пагнала дачка пасвіць ...»
- ✓ «… на бабу насварыўся ...»
- ✓ «..вярнуўся дахаты, пераапрануўся …»
- ✓ «… пад ёлачкай і плача.»
- ✓ «… Мядзведзю пра сваю ...»
- ✓ «Я таго звера ведаю – гэта ... »
- ✓ «… пастукаў хвастом у дзверы і кажа …»
- ✓ «…напужалася і кулем выскачыла ...»

***Трэці этап. Групавая праца.***

Праца ўдзельнікаў групы адбываецца наступным чынам.

1) Капітан удзельнікам сваёй каманды раздае па адным (або некаторым вучням па два) пазлу(ы). Кожны з іх зачытвае свой пазл, сумесна абмяркоўваюць, вызначаюць назву казкі і яго аўтара.

2) Кожны ўдзельнік каманды адчыняе падручнік, знаходзіць у казцы вытрымку з тэксту (свой пазл).

3) Сумесна абмяркоўваючы, раскладваюць пазлы ў паслядоўнасці адбывалых падзей і зачытваюць іх.

***Чацвёрты этап. Прэзентацыя вынікаў працы кожнай групы.***

Кожная каманда атрымлівае заданні:

- зачытаць пазлы, якія яны атрымалі ў канвертах, каб удзельнікі іншых каманд вызначылі назву казкі і аўтара;
- зачытаць пазлы ў паслядоўнасці падзей, якія адбываюцца;
- зрабіць кароткі пераказ казкі.

***Падвядзенне вынікаў.***

***Рэфлексія.***

Такім чынам, выкарыстанне інтэрактыўнага метаду «Казачная мазаіка» на ўроках літаратурнага чытання дазваляе:

- замацоўваць, абагульняць і сістэматызаваць веды, якія навучэнцы вывучалі па тэме, раздзеле, на працягу чвэрці, паўгоддзя ці навучальнага года;
- фарміраваць маўленча-камунікатыўную кампетэнцыю;
- развіваць уменні працаваць у камандзе;
- развіваць уменні працаваць з тэкстам;
- кожнаму ўдзельніку каманды праяўляць сябе, паказваць свае веды, уменні, свой характар, валявыя якасці;
- развіваць навыкі чытання, гаварэння, слухання;
- садзейнічаць эмацыйнай насычанасці працэсу правядзення ўрокаў, пры якім усе ўдзельнікі адчуваюць задавальненне, асабліва калі прадстаўляюць вынікі працы;
- выхоўваць эмацыйную спагадлівасць; развіваць пачуццё суперажывання героям.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ:

1. Антонава, Н. У. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапаможнік для 2 кл. устаноў агульнай сэрэдняй адукацыі з рус. мовай навучання : у 2 ч. / Н. У. Антонава, І. А. Буторына, Г.А. Галяш. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – Ч. 1. – 136 с. : іл.